Пятніца, 06 Лістапад 2020

Арыштам на 7 сутак за выказванне меркавання пакараны ў Полацку Генадзь Бердзянёў

Друкаваць (/news/sud/item/3789-aryshtam-na-7-sutak?tmpl=component&print=1) | Эл. пошта (/component/mailto/?tmpl=component&template=lt_news&link=fa079e61fd6a8d0ceb6d6e0a2aea1b02990b54ad)

Ацаніць гэты матэрыял (1 голас)



(/media/k2/items/cache/6052b471b50b91653af7591d4b0162e1_XL.jpg)

Генадзь Бердзянёў

У Полацкім судзе 4 лістапада намеснік старшыні суду Уладзімір Бясецкі пакараў на 7 сутак адміністрацыйнага арышту Генадзя Бердзянёва за ўдзел у масавым мерапрыемстве 25 кастрычніка. Генадзь сцвярджаў на судзе, што «выказваў сваё меркаванне індывідуальна, пратэстуючы супраць затрымання мірных грамадзян».

Генадзя Бердзянёва затрымала міліцыя 25 кастрычніка, калі ён ішоў наперадзе групы грамадзян з накінутым на плечы бел-чырвона-белым сцягам. Яго пратрымалі ў ізалятары часовага ўтрымання (ІЧУ) Полацку 3-е сутак.

На судзе спадар Генадзь расказаў, што, даведаўшыся з паведамлення МУС аб затрыманні 280 грамадзян у Беларусі за мірны выхад на вуліцу супраць катаванняў і падтасоўкі вынікаў выбараў, прыняў 25 кастрычніка індывідуальнае, спантаннае рашэнне выказаць сваё меркаванне наконт гэтых падзей і выйсці на вуліцу з дзяржаўным сімвалам 1991-95 гг. – бел-чырвона-белым сцягам.

Генадзь Бердзянёў патлумачыў, што лічыць свае дзеянні адпаведнымі заканадаўству Беларусі, у якім прыярытэтны прынцып вяршэнства права, а не закона.

> *«Маё права мець і свабодна выказваць уласнае меркаванне замацаванае ў артыкуле 33 Канстытуцыі, якая мае найвышэйшую заканадаўчую сілу ў Беларусі згодна з законам аб нарматыўных актах. Мной ажыццяўляліся гэтыя правы сумленна і разумна»*, – заявіў актывіст.

Між тым, дзеянні міліцыі Генадзь назваў несумленнымі. Патлумачыў чаму.

> *«Па-першае, ніхто масавае мерапрыемства 25 кастрычніка не арганізоўваў. У кожным разе, мне нічога не вядома пра арганізацыю масавага мерапрыемства. Па-другое, я прыняў рашэнне аб спосабе выказвання меркавання наконт важнай грамадскай падзеі індывідуальна, без удзелу іншых асоб. Па-трэцяе, маё рашэнне было спантанным і патрабавала неадкладнага рэагавання з прычыны грамадскай важнасці падзей, таму я не мог арганізоўваць масавае мерапрыемства ў адпаведнасці з законам аб масавых мерапрыемствах»*, – сказаў Генадзь Бердзянёў.

«Адпаведна закон аб масавых мерапрыемствах мае прававыя дзеянні не рэгулюе. У Канстытуцыі абвяшчаецца: «Кожнаму гарантуецца свабода меркаванняў, перакананняў і іх свабоднае выказванне». Згодна з законам, суды ажыццяўляюць правасуддзе на аснове Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасці з ёй нарматыўных прававых актаў. Закона аб свабодзе выказвання меркавання ў Беларусі няма, таму я кіраваўся непасрэдна артыкулам 33 Канстытуцыі», – патлумачыў абвінавачаны.

Спадар Генадзь, які на той момант адседзеў ужо трое сутак, прапанаваў суду кампраміснае рашэнне: *«Калі суд, кіруючыся Канстытуцыяй, якім-небудзь законам і сваім унутраным перакананнем, прыме рашэнне аб прыцягненні мяне да адказнасці, то прапаную прызначыць мне 3 сутак арышту, якія я ўжо адбыў у ІЧУ. У гэтым выпадку я не буду абскарджваць гэтае рашэнне суду, маючы на ўвазе неэфектыўнасць судовай абароны ў Беларусі 2020 года»*.

Аднак суддзя **Уладзімір Бясецкі** на такі кампраміс не пайшоў. *«Прызначыць сем сутак арышту»*, – агучыў рашэнне.

Генадзь прасіў вярнуць яму сцяг, які быў далучаны да справы, але суддзя адмовіў.



Гэта ўжо трэцяе адміністрацыйнае пакаранне Генадзя Бердзянёва за апошнія тры месяцы (два арышты і штраф у памеры 5 базавых велічынь).

Аляксандр Марозаў

Апублікавана ў Суд (/news/sud)

Тэгі: Полацак (/itemlist/tag/Полацак) Генадзь Бердзянёў (/itemlist/tag/Генадзь%20Бердзянёў) Уладзімер Бясецкі (/itemlist/tag/Уладзімер%20Бясецкі) артыкул 23 34 КаАП (/itemlist/tag/артыкул%2023%2034%20КаАП)

Яшчэ ў гэтым разьдзеле: « Міколу Качурцу прысудзілі 15 сутак арышту. Ён не затрыманы (/news/sud/item/3788-jon-ne-zatrymany) Студэнтку ВДМУ Паліну Нітчанка аштрафавалі на 648 рублёў за ўдзел у акцыі са спевамі «Перамен!» » (/news/sud/item/3791-palinu-nitchanka-ashtrafavali)

Вярнуцца ў пачатак (/news/sud/item/3789-aryshtam-na-7-sutak#startOfPageId3789)

© 2011 - 2023 Віцебская вясна (/). Пры выкарыстаньні матэрыялаў абавязковая гіпэрспасылка. Email: vitebskspring@proton.me (mailto:vitebskspring@proton.me)

(Https://t.me/Vitebskspring)